УДК 811.161.3

# НАЗОЎНІКІ-КАМПАЗІТЫ З ГАЛОЎНЫМ СЛОВАМ ДУМКА Ў ПАЭТЫЧНЫХ ТВОРАХ А. РАЗАНАВА

***М. А. Самсонава*** (МДУ імя А. А. Куляшова)
Навук. кір. ***В. М. Шаршнёва***,
канд. філал. навук, дацэнт

У паэтычным маўленні А. Разанава зафіксаваны розныя паводле структурных асаблівасцей аказіянальныя ўтварэнні. Значнае месца сярод іх займаюць назоўнікі-кампазіты з апорным кампанентам, роўным самастойнаму слову, сувязь паміж кампанснтамі выражаецца графічна пры дапамозе дэфіса: *трава-гараджанка, шчаслівіцы-вербы* і інш.

Асаблівую цікавасць выклікаюць назоўнікі-кампазіты з галоўным словам *думка* ў творчасці А. Разанава. У тлумачальным слоўніку беларускай мовы прыводзіцца наступнае вызначэнне: «Думка – тое, што з'явілася ў выніку развaг, меркавання; прадукт мыслення» [1, с. 209].

Аўтар стварае парныя аказіянальныя назоўнікі-кампазіты з супрацьлеглым значэннем (антанімічныя адносіны), параўн.: *Адкрываецца абсяг / **думка-голас**, / а **думцы-бязмоўю** / адкрываецца неабсяжнасць* [2, с. 81]; *Што робіцца зараз там, / у абсягах вашых, / **думка-галубка** / і **думка-крумкач**?!* [2, с. 89]. Супрацьпастаўленне кампазітаў падкрэслівае кантрастнасць назоўніка *думка* з розных бакоў, узмацняе эмацыянальна-стылістычнае гучанне, выклікае неадназначныя пачуцці да яе. У складаных структурна-семантычных цэлых спалучаюцца асновы адушаўлёнага неасабавага і неадушаўлёнага абстрактнага назоўнікаў: *Паслаў у прастору думку, апамятаўшыся – другую... / Што робіцца зараз там, / у абсягах вашых, / **думка-галубка** / і **думка-крумкач**?!* [2, с. 89]. Эпітэты-прыдаткі *галубка, крумкач* – гэта сімвалы, характэрныя для беларускага фальклору. Яны засноўваюцца на шматлікіх асацыятыўных сувязях птушак і людзей. Традыцыйным мысленнем *голуб* адносіцца да – чыстых, божых птушак, для яго характэрна пазітыўная ацэнка і любоўная сімволіка, а *крумкач* звязваецца са светам памерлых. Арніталагічныя вобразы паэтычна асэнсаваны, з іх дапамагай аўтар дае рознапланавую характарыстыку паняццю *думка.*

Такім чынам, назоўнікі-кампазіты з галоўным словам *думка* з'яўляюцца моцным экспрэсіўным сродкам, характарызуюцца яркай вобразнасцю і эмацыянальнай насычанасцю, перадаюць адпаведны настрой і душэўны стан аўтара.

**Літаратура**

1. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 2. Г – К / [Рэд. тома А. Я. Баханькоў]. – Мінск : Гал. рэд. Беларус. Сав. Энцыклапедыі, 1978. – 768 с.
2. Разанаў, А. Танец з вужакамі: Выбранае / А. Разанаў. – Мінск : Маст. літ., 1999. – 462 с.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова